СЁННЯ Ў НУМАРЫ: РАЗМЕРКАВАНЫ АБАВЯЗКІ ● МІТЫНГ ДРУЖБЫ ● ЗНАЁМЦЕСЯ: КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ МАСКОЎСКАГА РАЁНА г. МІНСКА ● «ВЕСНІК БДУ» ● ШЧАСЛІВЫ ЛЁС ПЕДАГОГА І ВУЧОНАГА.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 32 (1182) ● 24 лістапада 1977 г. Цана 2 кап.

РАЗМЕРКАВАНЫ АБАВЯЗКІ

АДБЫЎСЯ ПЕРШЫ АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПЛЕНУМ КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ, НА ЯКІМ БЫЛІ РАЗМЕРКАВАНЫ АБАВЯЗКІ ПАМІЖ ЧЛЕНАМІ КАМІТЭТА:

А. Тозік — сакратар камітэта камсамола БДУ, кандыдат гістарычных навук;

В. Левашэвіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце;

В. Рошчын — намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце;

А. Калінка — намеснік сакратара камітэта камсамола па інтэрнацыянальнаму выхаванню;

М. Прыгодзіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па вучэбнай і навуковай рабоце, аспірант філфака;

П. Брыгадзін — намеснік сакратара камітэта камсамола па працоўнаму выхаванню, камандзір зводнага СБА БДУ, выкладчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

В. Левашэвіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце, загадчык аддзела;

В. Ляоненка — загадчыца сектара ўліку;

Т. Абрамчык — загадчыца сектара вучобы камсамольскага актыву, студэнтка IV курса філфака;

С. Масейка — намеснік загадчыка сектара вучобы камсамольскага актыву, студэнтка IV курса гістфака;

Г. Ільяшчук — старшыня штаба «Камсамольскі пражэктар» БДУ, аспірантка кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў;

А. Аладзьін — намеснік старшыні штаба «Камсамольскі пражэктар» БДУ, студэнт II курса гістфака;

У. Навакоў — камандзір аператыўнага камсамольскага атрада, студэнт IV курса юрфака;

Т. Нічыпарук — загадчыца прэс-цэнтра камітэта камсамола, студэнтка IV курса журфака;

М. Абрамчук — старшыня персанальнай камісіі, супрацоўнік фізфака;

П. Гаранін — намеснік старшыні персанальнай камісіі, супрацоўнік ФПМ;

Т. Свіціна — загадчыца сектара інфармацыі і кантролю, студэнтка IV курса геафака;

І. Савачкіна — намесніца загадчыка сектара інфармацыі і кантролю, студэнтка III курса гістфака.

ІДЭАЛАГІЧНЫ АДДЗЕЛ

В. Рошчын — намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце, загадчык аддзела;

У. Карагін — загадчык сектара Ленінскага заліку і грамадска-палітычнай практыкі, студэнт V курса гістфака;

Н. Шаўчэнка — загадчыца сектара ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання, стажор-выкладчык кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму;

А. Кавалёва — намеснік загадчыка сектара ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання, студэнтка II курса філфака;

К. Кунцэвіч — загадчык сектара ваенна-патрыятычнай і спартыўнай работы, аспірант кафедры навуковага камунізму;

А. Сашчэка — намеснік загадчыка сектара ваенна-патрыятычнай і спартыўнай работы, студэнт II курса юрфака;

В. Мацэль — загадчык сектара па рабоце ў інтэрнатах, стажор-выкладчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў;

С. Баранаў — намеснік загадчыка сектара па рабоце ў інтэрнатах, супрацоўнік фізфака;

Л. Юрчык — загадчыца сектара шэфскай работы, студэнтка IV курса гістфака;

Н. Гаварэнь — намеснік загадчыка сектара шэфскай работы, студэнтка IV курса біяфака;

І. Лазарэнка — член сектара шэфскай работы, студэнтка II курса хімфака;

В. Васпякова — загадчыца сектара сацыялістычнага спаборніцтва, студэнтка III курса юрфака;

Д. Мядзведзеў — намеснік загадчыка сектара сацыялістычнага спаборніцтва, студэнт III курса мехмата;

І. Вірынская — загадчыца сектара прававога выхавання, студэнтка I курса юрфака;

В. Андруховіч — загадчык лектарскай групы, аспірант кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў;

З. Мельнік — загадчыца сектара гісторыі камсамольскай арганізацыі БДУ, старшыня штаба групы «Доўг», студэнтка III курса гістфака.

АДДЗЕЛ ВУЧЭБНАЙ І НАВУКОВАЙ РАБОТЫ

М. Прыгодзіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па вучэбнай і навуковай рабоце, загадчык аддзела, аспірант філфака;

У. Пузікаў — загадчык сектара сумеснай работы з кафедрамі грамадскіх навук, аспірант кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў;

А. Прасвірніна — старшыня савета выдатнікаў, студэнтка IV курса біяфака;

У. Гуслеў — старшыня студэнцкага навуковага савета, супрацоўнік хімфака;

Т. Пушкарова — старшыня савета маладых вучоных БДУ, супрацоўніца хімфака, кандыдат хімічных навук;

У. Бандарчук — загадчык сектара новага прыёму, дэкан грамадскіх падрыхтоўчых курсаў, студэнт IV курса фізфака;

В. Зубарэвіч — загадчыца сектара работы з першакурснікамі, студэнтка IV курса філфака;

А. Абрамовіч — загадчык сектара арганізацыі работы ВВК, студэнт III курса факультэта радыёфізікі.

АДДЗЕЛ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ І РАБОТЫ З ЗАМЕЖНЫМІ СТУДЭНТАМІ

А. Данекін — загадчык аддзела;

Р. Новік — загадчыца сектара шэфскай работы з маладзёжнымі арганізацыямі і зямляцтвамі замежных студэнтаў.

ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ

П. Брыгадзін — намеснік сакратара камітэта камсамола па працоўнаму выхаванню, камандзір зводнага СБА БДУ, выкладчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў;

В. Саўчанка — галоўны інжынер ШПС, студэнт II курса юрфака;

У. Волкаў — адказны ШПС за арганізацыю сельгасработ.

БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА

В. Блішч, В. Васпякова, В. Гарус, А. Данекін, А. Калінка, В. Левашэвіч, З. Мельнік, М. Няхайчык, М. Прыгодзіч, В. Рошчын, А. Тозік, Т. Свіціна, Н. Шаўчэнка.

САКРАТАРЫ КАМІТЭТАЎ КАМСАМОЛА

Біяфак — **Л. Перадрый,** студэнтка IV курса;

Геафак — **Л. Гайдукевіч,** студэнт II курса;

Журфак — **А. Саламаха,** студэнт II курса;

Гістфак — **В. Міхальчук,** студэнт III курса;

Механіка-матэматычны — **А. Казулін,** член камітэта камсамола БДУ, студэнт III курса;

ФПМ — **В. Гарус,** член камітэта камсамола БДУ, студэнт IV курса;

Фізфак — **В. Блішч,** член камітэта камсамола БДУ, студэнт II курса;

Філфак — **Ж. Рымкевіч,** член камітэта камсамола БДУ, студэнтка IV курса;

Хімфак — **А. Рухля,** супрацоўнік хімфака;

Юрфак — **С. Губскі,** член камітэта камсамола БДУ, студэнт III курса;

Радыёфізічны факультэт — **А. Ільюценка,** член камітэта камсамола БДУ, студэнт III курса;

Сакратар камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў — **М. Няхайчык.**

***

НДІ ПФП — **А. Мінько,** член камітэта камсамола БДУ, малодшы навуковы супрацоўнік;

ВЦ — **А. Грышановіч,** член камітэта камсамола БДУ, старшы навуковы супрацоўнік;

АГЧ — **Г. Баранаў,** старшы навуковы супрацоўнік АНТІ;

Друкарня і выдавецтва — **В. Праскурава,** малодшы рэдактар выдавецтва БДУ;

Падрыхтоўчы факультэт — **Л. Шчучко,** выкладчык кафедры грамадскіх дысцыплін падрыхтоўчага факультэта;

СКТБ з ВВ — **Ф. Корзюк,** член камітэта камсамола БДУ, загадчык сектара;

ІПК — **Н. Сакалова,** статыст-машыністка.

МІТЫНГ ДРУЖБЫ

15 лістапада ў сталіцу Савецкай Беларусі горад-герой Мінск прыбыла дэлегацыя Саюза камуністычнай моладзі Хо Шы Міна Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам на чале з першым сакратаром ЦК СКМ, членам ЦК Кампартыі В'етнама, дэпутатам Нацыянальнага сходу Данг Куок Бао, якая знаходзіцца ў СССР па запрашэнню ЦК ВЛКСМ. У састаў дэлегацыі ўваходзяць таксама загадчык міжнароднага аддзела ЦК СКМ Хо Шы Міна Хо Ань Зунг, сакратар Аб'яднанага камітэта СКМ Хо Шы Міна пры пасольстве СРВ у СССР Нгуен Ван Туан, намеснік сакратара Аб'яднанага камітэта СКМ Хо Шы Міна пры пасольстве СРВ у СССР Фам Куан Зы.

Першы дзень знаходжання дэлегацыі Саюза камуністычнай моладзі Хо Шы Міна СРВ на беларускай зямлі завяршыўся мітынгам салідарнасці савецкай і в'етнамскай моладзі, які адбыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна.

Прыветліва расчыніла свае дзверы актавая зала БДУ. У ёй шумна: гучаць савецкія і в'етнамскія песні, на розных мовах — словы віншаванняў, словы дружбы. Моладзь універсітэта сустракае дарагіх гасцей: першага сакратара ЦК СКМ Хо Шы Міна, члена ЦК КПВ, дэпутата Нацыянальнага сходу Данг Куок Бао, загадчыка міжнароднага аддзела ЦК СКМ Хо Шы Міна Хо Ань Зуанга, сакратара Аб'яднанага камітэта СКМ Хо Шы Міна пры пасольстве СРВ у СССР Нгуен Ван Туана, яго намесніка Фам Куан Зы, а таксама кандыдата ў члены бюро ЦК ВЛКСМ, першага сакратара ЦК ЛКСМБ К. М. Платонава, намесніка загадчыка аддзела ЦК ВЛКСМ А. В. Шчалкунова і адказнага арганізатара ЦК ВЛКСМ Я. А. Вярбіцкага.

Гучаць дзяржаўныя гімны СРВ, СССР, БССР. Мітынг салідарнасці савецкай і в'етнамскай моладзі адкрывае сакратар камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна А. А. Тозік.

— Дарагія в'етнамскія сябры! Таварышы! Сёння мы з'яўляемся ўдзельнікамі вялікай і радаснай падзеі. Тут, на беларускай зямлі, палітай крывёю тысяч і тысяч савецкіх патрыётаў, зямлі герояў, мы сустракаемся з нашымі вернымі і шчырымі сябрамі — пасланцамі гераічнай в'етнамскай моладзі. Мы рады вітаць у сценах нашага універсітэта дарагіх гасцей — членаў дэлегацыі СКМ Хо Шы Міна В'етнама на чале з таварышам Данг Куок Бао.

Дарагія таварышы! Нас радуюць дасягненні в'етнамскага народа ў будаўніцтве сацыялізму. Слаўная в'етнамская моладзь прадэманстравала прыклады масавага гераізму ў барацьбе супраць амерыканскіх агрэсараў. Мы, як і вы, дарагія в'етнамскія сябры, ганарымся бяспрыкладнай мужнасцю і стойкасцю в'етнамскага народа.

Савецкае студэнцтва, вернае справе пралетарскага інтэрнацыяналізму, заўсёды прымае актыўны ўдзел у шырокай кампаніі салідарнасці з моладдзю В'етнама. Савецкая моладзь з вялікай увагай сочыць за справамі сацыялістычнага В'етнама і заўсёды гатова працягнуць яму руку братэрскай дапамогі. Ад усёй душы мы жадаем вам поспехаў і гаворым сёння: калі ласка, дарагія в'етнамскія браты!

З прывітальным словам у адрас гасцей і ўсіх в'етнамскіх камсамольцаў выступае першы сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі К. М. Платонаў:

— Дарагі таварыш Данг Куок Бао! Дарагія госці! Таварышы!

Мы сустрэлі нашых братоў па класу і зброі. В'етнамскі гераічны народ адстаяў у смяротнай барацьбе з імперыялістамі сваю нацыянальную незалежнасць і ўпэўнена ідзе па шляху сацыялізму.

Інтэрнацыяналізм нашай мо-

(Заканчэнне на 2-й стар.).



На здымках: у прэзідыуме; выступае першы сакратар ЦК ЛКСМБ К. М. Платонаў; выступае першы сакратар ЦК СКМ Хо Шы Міна Данг Куок Бао. Фота В. ПАТАПЕНКІ.

Гарачае прывітанне ўдзельнікам II справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі Маскоўскага раёна г. Мінска

ЭНТУЗІЯЗМ І ТВОРЧАСЦЬ МАЛАДЫХ

Камсамольцы і моладзь Маскоўскага раёна горада Мінска паспяхова ажыццяўляюць рашэнні XXV з'езда КПСС, уносяць дастойны ўклад ва ўсенародную справу будаўніцтва камунізму.

«Пяцігодцы эфектыўнасці і якасці — энтузіязм і творчасць маладых!» — пад такім дэвізам працуе камсамол раёна. Невычэрпна імкненне кожнага камсамольца ўнесці свой уклад у вялікую справу будаўніцтва камунізму.

Шырока разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва за ганаровае права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола Цэнтральнаму Камітэту КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, больш 300 юнакоў і дзяўчат, 5 камсамольска-маладзёжных калектываў датэрмінова, да 7 лістапада 1977 года, выканалі заданні двух гадоў дзесятай пяцігодкі.

У ходзе працоўнай вахты «60-годдзю Кастрычніка — 60 ударных тыдняў» кожны малады чалавек раёна перагледзеў свае сацыялістычныя абавязацельствы, намеціў новыя, больш высокія рубяжы.

Маладыя спецыялісты, рабочыя, камсамольска-маладзёжныя калектывы прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў дабіваюцца таго, каб высокія дасягненні перадавікоў станавіліся працоўнай нормай кожнага дня.

Больш 3 тысяч юнакоў і дзяўчат раёна падтрымалі ініцыятыву камсамольцаў цэха № 2 фабрыкі імя В. В. Куйбышава «Кожны камсамолец — пост якасці».

Камсамольцы і моладзь МВАА «Луч» змагаюцца за ганаровае права быць членамі ўдарнага атрада дзесятай пяцігодкі.

Кожны трэці працуючы камсамолец у раёне з'яўляецца ударнікам камуністычнай працы, кожны другі змагаецца за прысваенне гэтага ганаровага звання.

Раённая камсамольская арганізацыя ганарыцца такімі перадавікамі вытворчасці і выдатнікамі вучобы, як Т. Рабецкая — кавалер ордэна Знак Пашаны, малады гвардзеец пяцігодкі, ударнік камуністычнай працы, рабочая МВАА «Луч»; В. Лагацкая — дэпутат Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, ударнік камуністычнай працы, член камітэта камсамола Мінскай ордэна Знак Пашаны фабрыкі імя В. В. Куйбышава; У. Грыняк — ленінскі стыпендыят, студэнт факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна; Л. Валюк — ленінскі стыпендыят, студэнтка гістарычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна; Н. Урбан—выдатніца вучобы, вучаніца сярэдняй школы № 101; В. Ярэмчук — выдатніца вучобы, студэнтка Мінскага індустрыяльнага тэхнікума будаўнічых матэрыялаў.

Больш 3500 студэнтаў раёна сёлета працавала ў студэнцкіх будаўнічых атрадах на будоўлях Беларусі, Казахстана, РСФСР, Малдавіі. Імі асвоена звыш 9 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў.

Камсамольская арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна прызнана пераможцай абласнога аглядуконкурсу па арганізацыі працоўнага семестра. Больш 45 тысяч рублёў пералічана байцамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў у Фонд міру і ў фонд XI фестывалю моладзі і студэнтаў.

На сваіх старэйшых таварышаў раўняюцца школьны камсамол і піянерыя раёна. Усе іх добрыя справы і пачынанні з'яўляюцца надзейным залогам таго, што раённай камсамольскай арганізацыі расце дастойная змена. Больш 650 школьнікаў прыняло ўдзел у пятай працоўнай чвэрці. Яны аказалі значную дапамогу сельскай гаспадарцы, сабралі дзесяткі тон металалому, макулатуры, многа лекавых раслін.

Юнакі і дзяўчаты раёна ўмела спалучаюць практыку камуністычнага будаўніцтва з павышэннем свайго агульнаадукацыйнага і ідэйна-палітычнага ўзроўню.

Каля 800 чалавек займаюцца ў вячэрніх і завочных школах рабочай моладзі. У 132 гуртках сістэмы камсамольскай і палітычнай вучобы больш 3,3 тысячы юнакоў і дзяўчат глыбока і дэталёва вывучылі праект Канстытуцыі СССР і вывучаюць асноўныя палажэнні і артыкулы новай Канстытуцыі СССР.

Экзаменам на палітычную сталасць, на вернасць партыі і народу стаў Усесаюзны Ленінскі залік «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!», у якім удзельнічаюць больш 30 тысяч юнакоў і дзяўчат раёна. У камсамольскай арганізацыі раёна вядзецца вялікая і мэтанакіраваная работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі. Ва ўсесаюзным паходзе па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа прынялі ўдзел больш 10 тысяч юнакоў і дзяўчат.

Больш 25 тысяч юнакоў і дзяўчат паспяхова здалі нарматывы комплексу «Гатоў да працы і абароны».

Новымі поспехамі ў вучобе сустрэў 60-годдзе Вялікага Кастрычніка камсамол ВНУ, тэхнікамаў, прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў і агульнаадукацыйных школ раёна.

Па выніках летняй сесіі 1977 года ў ВНУ і школах раёна абсалютная паспяховасць па агульнаадукацыйных дысцыплінах склала 99 працэнтаў. Значна палепшылася якасць ведаў. На «4» і «5» паспявае больш паловы студэнтаў ВНУ і школьнікаў.

Падзеяй вялікай гістарычнай важнасці, якая садзейнічае значнаму павышэнню працоўнай і палітычнай актыўнасці моладзі, з'явілася абмеркаванне праекта Канстытуцыі (Асноўнага Закона) СССР і прыняцце новай Канстытуцыі СССР.

Юнакі і дзяўчаты раёна лічаць свяшчэнным доўгам і ганаровым абавязкам кожнага маладога чалавека быць у першых радах будаўнікоў камуністычнага грамадства.

М. ЖАБАЎ,
першы сакратар
Маскоўскага РК ЛКСМБ.

1620 камсамольцаў Маскоўскага раёна г. Мінска падпісалі Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Сярод іх К. Лушчынская, рабочая завода медпрэпаратаў; М. Яўстратаўскі, інжынер праектнага інстытута «Белгіпрахарчпрам»; А. Чычук, камсорг 10-га «Г» класа 101-й школы; Сяргей Новікаў, студэнт III курса журфака БДУ імя У. І. Леніна.

Фота А. ШАРАВА.



МІТЫНГ ДРУЖБЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ладзі вельмі ярка праяўляецца ў шырокай і заўсёды мацнеючай салідарнасці з В'етнамам. Гэта асабліва добра бачна на прыкладзе нашай рэспублікі.

Лёс беларускай Хатыні напаткаў в'етнамскую вёску Сангмі. Блізкія і зразумелыя былі нам гераічная барацьба і мужнасць в'етнамскага народа. Моладзь нашай рэспублікі робіць усё, каб унесці свой уклад у гэтую барацьбу. Мы ганарымся, што беларускія камсамольцы з'яўляюцца аднымі з ініцыятараў кампаніі «Савецкая моладзь — юнаму пакаленню В'етнама». Ганарымся тым, што словам і справай умацоўваем нашу салідарнасць. Наша салідарнасць — гэта працоўныя вахты, суботнікі, нядзельнікі ў фонд В'етнама. Гэта ўдзел моладзі ў камплектаванні «Каравана салідарнасці», гэта ўдарная праца рэспубліканскага будаўнічага атрада, пералічыўшага толькі ў гэтым годзе на будаўніцтва Палаца піянераў у Ханоі 40 тыс. рублёў. Гэта ўдзел піянераў у зборы лекавых траў для дзіцячага шпіталя ў Ханоі.

Цесныя сяброўскія сувязі звязваюць в'етнамскіх студэнтаў, якія вучацца ў БДУ імя У. І. Леніна, і маладых рабочых Мінскага камвольнага камбіната імя 50-годдзя БССР.

Тыдні дружбы, абмен вопытам камсамольскай работы, сумесныя вечары, экскурсіі, спартыўныя спаборніцтвы — вось далёка не поўны пералік гэтага супрацоўніцтва.

«У дні міру, як і ў дні вайны, мы з вамі будзем разам, у адным страі. Падтрымка В'етнама — гэта наш інтэрнацыянальны доўг». Гэтыя словы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева як нельга лепш выказваюць думкі і пачуцці савецкіх людзей.

У суровыя дні вашай барацьбы супраць амерыканскага імперыялізму мы былі ўпэўнены: В'етнам пераможа. А цяпер мы ўпэўнены ў тым, што працавіты, таленавіты в'етнамскі народ паспяхова будзе здзяйсняць сацыялістычнае будаўніцтва. І мы гаворым: сёння, як і ўчора, савецкі народ, савецкая моладзь з вамі, дарагія в'етнамскія сябры! Няхай жыве гераічны в'етнамскі народ і яго слаўная моладзь! Няхай жыве ў вяках і квітнее сяброўская непарушная дружба паміж савецкай і в'етнамскай моладдзю!

Да трыбуны падыходзіць Данг Куок Бао. Камсамольцы, стоячы, вітаюць пасланца гераічнага народа, народа-барацьбіта, народа-пераможцы.

— Дарагія таварышы, сябры! Дазвольце мне ад усяго в'етнамскага народа, ад в'етнамскай моладзі перадаць шчырае прывітанне камсамольцам беларускай сталіцы, студэнтам універсітэта, усёй моладзі вашай краіны. Мы з вялікай радасцю прымаем удзел у гэтым мітынгу, які праходзіць у сценах універсітэта, створанага па дэкрэту У. І. Леніна. Ідэі правадыра Кастрычніцкай рэвалюцыі, 60-годдзе якой святкаваў увесь свабодалюбівы народ свету, жывуць у сэрцах і думках в'етнамскіх людзей. У апошнія месяцы на ўсіх заводах і фабрыках, ва ўсіх установах краіны шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Рэвалюцыя 1917 года паклала пачатак будаўніцтву сацыялізму і камунізму. В'етнамскі народ ганарыцца дружбай і брацкімі сувязямі з Савецкай краінай — краінай, якая адкрыла новую эру ў гісторыі чалавецтва.

— Слава КПСС! Слава вялікаму савецкаму народу! Мы, в'етнамскія людзі, глыбока ўдзячны вам, дарагія савецкія сябры, за падтрымку і дапамогу ў барацьбе супраць амерыканскага імперыялізму.

Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

На сцэну выносяць вымпел ЦК СКМ Хо Шы Міна В'етнама — памятны падарунак — выражэнне шчырых і сардэчных пачуццяў да нашай краіны. Пад бурныя авацыі таварыш Данг Куок Бао ўручае яго першаму сакратару ЦК ЛКСМБ К. М. Платонаву. На трыбуне прэзідэнт клуба інтэрнацыянальнай дружбы БДУ імя У. І. Леніна студэнтка III курса біяфака Людміла Сычова.

— Мы, беларускія студэнты, — гаворыць яна, — добра выконваем ленінскі запавет быць інтэрнацыяналістамі. Мы імкнёмся да таго, каб в'етнамскім студэнтам добра жылося і цікава вучылася ў нашым універсітэце.

Яна запэўніла ўдзельнікаў мітынгу ў тым, што савецкая моладзь будзе ўмацоўваць і далей братэрскую дружбу і салідарнасць з гераічным народам В'етнама.

Слова бярэ сакратар арганізацыі Саюза камуністычнай моладзі Хо Шы Міна В'етнама студэнтаў і аспірантаў, якія навучаюцца ў Мінску, Фам Тхе Лонг.

— Дарагія таварышы! Сёння дзень дружбы і братэрства паміж в'етнамскай і савецкай моладдзю, паміж нашымі краінамі. Радасна і тое, што наш мітынг адбываецца ў год, знамянальны сваімі падзеямі для ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. Савецкі народ прыняў новую Канстытуцыю, увесь свет святкуе 60-годдзе Вялікага Кастрычніка. Мы, як і ўсе сумленныя людзі планеты, рады вашым поспехам.

Ад 200 в'етнамскіх студэнтаў і аспірантаў, якія навучаюцца ў Мінску, дазвольце павіншаваць вас, савецкія сябры, з гэтымі падзеямі і пажадаць новых і новых поспехаў у барацьбе за камунізм.

Няхай жыве камунізм! Няхай жыве вялікі савецкі народ! Няхай жыве моцная дружба паміж моладдзю СССР і СРВ!

Гучыць «Інтэрнацыянал». Разам з савецкімі ўдзельнікамі мітынгу пяюць і в'етнамскія сябры. З вуснаў усіх льюцца словы: «Гэта ёсць наш апошні і рашучы бой...»

Так, словы песні лепш за ўсё гавораць аб тым, што мэта ва ўсіх адна — адстаяць мір і шчасце на зямлі.

Пачуццё гонару за тое, што ты належыш да авангарду моладзі свету, змяняецца пачуццём адказнасці за шчасце людзей планеты. Наша агульная справа — не дапусціць больш трагедый Хатыні і Сангмі.

Пасля мітынгу быў дадзен канцэрт, у якім прагучалі песні аб міры і шчасці на зямлі.

В. ДУДКО,
А. МАРЧУК,
студэнты II курса
журфака.

ЯКАСЦЬ—СПРАВА КОЖНАГА

«Эфектыўнасць» і «якасць». Няма, мусіць, у цяперашні час у савецкіх людзей больш папулярных слоў. Абвешчаныя XXV з'ездам КПСС сімваламі дзесятай пяцігодкі, гэтыя словы сталі кроўнай справай мільёнаў працоўных.

Выпуск высакаякаснай прамысловай прадукцыі — гэта не толькі адна з умоў найбольш поўнага задавальнення матэрыяльных і культурных патрэбнасцей, якія пастаянна растуць, але і важны шлях ажыццяўлення закона нашага гаспадарчага будаўніцтва, сутнасць якога — дасягненне ў інтарэсах грамадства найбольшых вытворчых вынікаў пры найменшых затратах.

Адказваючы на заклік Камуністычнай партыі Савецкага Саюза «Даць прадукцыі больш, лепшай якасці, з меншымі затратамі», камсамольская арганізацыя Мінскай ордэна Знак Пашаны фабрыкі імя В. В. Куйбышава ўдзяляе гэтай рабоце вялікую ўвагу. Разнастайны асартымент вырабаў, якія выпускае фабрыка — дзелавыя папкі, элегантныя партфелі, прыгожыя жаночыя сумкі і паўсядзённыя школьныя ранцы. І да ўсяго гэтага прыкладзены рукі нашых камсамольцаў.

У 1975 годзе на справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі фабрыкі ўдарнай справай камсамольцаў была аб'яўлена работа па паляпшэнню якасці выпускаемай прадукцыі пад дэвізам «Выдатная якасць выпускаемай прадукцыі — справа кожнага». Выконваючы гэта рашэнне, камітэт камсамола, цэхавыя камсамольскія арганізацыі праводзяць канкрэтныя мерапрыемствы па яго ажыццяўленню.

Найбольш эфектыўнымі формамі работы па паляпшэнню якасці з'яўляецца правядзенне камсамольскіх дзён якасці, работа пад дэвізам «Кожны камсамолец — пост якасці», работа камісій па якасці. Усёй гэтай работай кіруе камсамольскі штаб якасці пры камітэце камсамола фабрыкі.

Сёння на фабрыцы працуе 450 камсамольскіх пастоў якасці, больш 500 камсамольцаў здаюць прадукцыю з першага прад'яўлення, 36 дабіліся права працаваць з камсамольскай гарантыяй якасці.

Флагманам у рабоце па паляпшэнню якасці прадукцыі, як заўсёды, з'яўляюцца камсамольскія арганізацыі абедзвюх змен цэха № 2. Работа камсамольскіх пастоў якасці, якая вядзецца пад дэвізам «Кожны камсамолец — пост якасці», была пачата напярэдадні адкрыцця XXV з'езда КПСС, а цяпер трывала увайшла ў вытворчае жыццё цэха. Камсамольцы вядуць барацьбу з бракам. Іх сігнальныя лісткі прымушаюць задумацца першы цэх, фурнітурны і АТК з групай уваходнага кантролю сыравіны і фурнітуры. Асаблівай увагі ў гэтай рабоце заслугоўваюць майстры — камсамолкі Ала Грыб і Марыя Данько. На іх участках стаіць надзейны заслон бракаваным замкам, рознаадценню матэрыялаў і многім іншым дробным недаробкам.

Работа камсамольска-маладзёжных участкаў майстроў Данько і Абрамовіч на фабрыцы добра вядома. Гэтыя два ўчасткі першымі на фабрыцы дабіліся права самастойна вызначаць гатунковасць прадукцыі. Ім у дзень камуністычнага суботніка ўручана асабістае кляймо ўчастка. Вялікую дапамогу ў гэтым аказала зладжаная работа камсамольскіх пастоў якасці. Вялася штодзённая карпатлівая камсамольская работа. Перавыхоўвалася свядомасць рабочых. У выніку кожны рабочы адчувае вялікую адказнасць за работу як сваю, так і астатніх членаў калектыву. З канвеераў гэтых участкаў сыходзіць прадукцыя з дзяржаўным Знакам якасці.

Работа на самаканторлі двух участкаў штогод дае эканомію ў 2600 рублёў.

Камсамольцы фабрыкі ганарацца сваімі справамі, бо ў тым, што колькасць рэкламацый і сума штрафаў за няякасную прадукцыю ў гэтым годзе ў параўнанні з мінулым паменшылася ў 2,5 раза, ёсць і наша доля працы.

В. КУЗНЯЦОВА,
сакратар камітэта камсамола ордэна Знак Пашаны скургалантарэйнай фабрыкі імя В. В. Куйбышава.





ЗЛАДЖАНЫ РЫТМ ЖЫЦЦЯ

На свет паявіўся яшчэ адзін чалавек...

— У вас сын, — сказалі маладому чалавеку, які з хваляваннем і трывогай хадзіў, нерваваўся пад вокнамі бальніцы.

Сын! Для яго гэта было вялікай радасцю... Праз некалькі гадзін ён павінен быў паехаць, а яму так хацелася паглядзець на свайго першынца. І ён убачыў яго праз акно. Малыш спакойна спаў. А бацька...

Ён думаў аб тым, што яму ўдалечыні ад роднага дома, у Казахстане, вельмі будзе не хапаць гэтай маленькай істоты, якую ён яшчэ ні разу не трымаў на руках, але ўжо любіў больш за жыццё...

Валерый Калеснікаў у гэтым годзе ўзначальвае студэнцкі будаўнічы атрад медыцынскага інстытута «Шукальнік-77».

Студэнты-медыкі гавораць, што паступіць у інстытут намнога лягчэй, чым стаць байцом атрада «Шукальнік». У яго ў гэтым годзе быў своеасаблівы юбілей: вось ужо 15 год запар студэнты працавалі ў зернесаўгасе «Правда» Уральскай вобласці. Сем год «Шукальнік» займае першае месца ў вобласці сярод студэнцкіх будаўнічых атрадаў і трэці год — у Казахстане. Так, слава ў атрада гучная.

Ды і камандзір атрада не навічок у будаўнічым руху. Шэсць разоў Валерый ездзіў летам на студэнцкія будоўлі, быў і радавым байцом і камісарам. А цяпер таварышы выбралі яго сваім важаком.

Цяжка бывае камандзіру: трэба, каб у атрадзе ўсе семдзесят сэрцаў біліся ў такт, каб рытм атраднага жыцця быў дакладным, зладжаным. Аднаму, без пастаяннай падтрымкі таварышаў, гэтага дабіцца немагчыма. Але тым і славіцца «Шукальнік», што яго байцоў звязвае моцная дружба і ўзаемаразуменне. Кожны год у атрад прыходзяць навічкі. Над імі зараз жа бяруць шэфства «ветэраны», вучаць таго, хто зноў прыбыў, усім прамудрасцям будаўніка. А калі працоўны семестр завяршаецца, «настаўнікі» дораць «вучням» свае кельмы», як бы перадаючы разам з імі свой энтузіязм, энергію і цяпло рук, у якіх былі гэтыя кельмы.

Успамінаючы мінулае працоўнае лета, Валерый Калеснікаў гаворыць, што яно было вельмі цяжкім для працаўнікоў саўгаса: ішлі дажджы, трэба было ў кароткія тэрміны ўбраць ураджай. Атрад, разумеючы гэта, стараўся, як мог, дапамагчы хлебаробам. Тэхніка выкарыстоўвалася з максімальнай нагрузкай. Як толькі якая-небудзь машына аказвалася «беспрацоўнай», яе адразу ж накіроўвалі ў поле...

Так, гарачым было лета. Байцы медінстытута асвоілі 999,4 тыс. рублёў капіталаўкладанняў. Студэнты-медыкі сталі пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва СБА ў Казахстане, а камандзір «Шукальніка-77» прызнан лепшым камандзірам у рэспубліцы.

Валерый зараз займаецца на шостым курсе санітарна-гігіенічнага факультэта медінстытута. Ён — член камітэта камсамола і другі ўжо год узначальвае штаб працоўных спраў, ленінскі стыпендыят.

Можна толькі здзіўляцца таму, як яму ўдаецца паспяхова спалучаць выдатную вучобу і грамадскую работу. Валерый лічыць, што адно другому не перашкода. Наадварот, займаючыся грамадскай работай, студэнт выпрацоўвае ў сабе такія якасці, як самадысцыпліна, настойлівасць у дасягненні мэты, сіла волі, уменне добра і рацыянальна планаваць свой час.

Я прашу майго субяседніка падзяліцца вопытам.

— Работа над сабой. Пастаянная, творчая, штодзённая работа — гэта галоўнае, — гаворыць ён. — Мне вельмі дапамагае тое, што я працую на кожнай лекцыі: не проста механічна вяду канспект, а стараюся асэнсаваць тое, што гаворыць выкладчык, адразу ж улавіць сутнасць пытання. Потым мне вельмі лёгка рыхтавацца да заняткаў. Вось і ўсё...

Гавораць, што ўсякая мудрасць простая (таму, відаць, яна і мудрасць). Так і тут: аказваецца, каб выдатна паспяваць, трэба толькі прымусіць сябе выконваць той мінімум, на які здольны кожны: пастаянна працаваць над сабой. Але ж здольны кожны, а выконваецца гэтае простае правіла не ўсімі.

Хутка сесія. Для Валерыя — гэта чарговае падвядзенне вынікаў, яшчэ адна праверка ведаў і сіл. Экзамены, залікі. Зноў работа і работа...

— Ведаеце, — гаворыць ён, — я як ленінскі стыпендыят проста не маю права атрымліваць дрэнныя адзнакі.

Пра камандзіра «Шукальніка-77» можна было б расказваць шмат. Але самае галоўнае ў ім — гэта адданасць сваёй будучай прафесіі. Валерый у медінстытуце — чалавек не выпадковы. За яго плячыма медвучылішча, служба ў арміі, падрыхтоўчае аддзяленне... Як бачыце, шлях да мэты быў не з лёгкіх. Але ў тым, напэўна, і заключаецца прыгажосць і паэзія нашага жыцця, што сваіх самых высокіх вяршынь мы дасягаем, пераадольваючы цяжкасці.

В. ШАЛІЎСКАЯ,
студэнтка II курса факультэта журналістыкі.

Алімпійскім будоўлям—камсамольскі клопат

Як вядома, горад-герой Мінск з'яўляецца алімпійскім горадам. У Мінску будуць праведзены адборачныя алімпійскія матчы па футболу, будуць узведзены многія спартыўныя збудаванні, рэканструяваны старыя. Некалькі спартыўных аб'ектаў запланавана ўвесці ў дзейнасць у гэтым годзе. Сярод іх — буйнейшы ў Еўропе лёгкаатлетычны манеж, валейбольны і фехтавальны залы.

Будаўнікі алімпійскіх комплексаў адчуваюць зараз значную нястачу рабочай сілы. Камсамольскія арганізацыі, моладзь Мінска могуць аказаць ім немалую дапамогу.

Камсамольцы кафедры біяфізікі фізічнага факультэта БДУ прапанавалі цікавае і карыснае пачынанне — шэфства камсамольцаў і моладзі факультэта над алімпійскімі будоўлямі нашага горада.

Нядаўна ў камітэце камсамола фізфака адбылося расшыранае пасяджэнне, на якім прысутнічалі старшыня Беларускага савета УФСТ «Дынама», вядомыя беларускія спартсмены-алімпійцы Юрый Смалякоў і Марыя Іткіна, кіраўнікі будаўніцтва алімпійскіх аб'ектаў. Адбылася дзелавая размова аб распрацоўцы канкрэтнага плана шэфскай дапамогі будаўнікам.

Як сказаў сакратар камітэта камсамола факультэта Валерый Бліш, плануецца, што кожная студэнцкая група адпрацуе на будаўніцтве 2—3 дні. Байцы фарміруемых зараз студэнцкіх будатрадаў 1978 года набудуць тут неабходныя для іх спецыяльнасці. Акрамя таго, у перыяд зімовых і летніх канікул на ўзвядзенні алімпійскіх аб'ектаў будзе арганізавана праца некалькіх будатрадаў.

Пачынанне фізікаў знайшло падтрымку ў будаўнікоў, беларускіх спартсменаў, кіраўніцтва савета «Дынама».

Вырашана, што лепшыя студэнты-будаўнікі стануць першымі гледачамі матчаў футбольнага алімпійскага турніра, якія пройдуць на рэканструяваным стадыёне «Дынама» ў Мінску.

У гэтыя дні першыя групы супрацоўнікаў і студэнтаў фізічнага факультэта выходзяць на будаўнічыя пляцоўкі стадыёна і спорткомплексу «Дынама».

Камсамольцы фізічнага факультэта заклікаюць усіх студэнтаў універсітэта падтрымаць гэтую ініцыятыву і ўнесці свой уклад у аказанне дапамогі будаўнікам.

В. ПАДВЕРБНЫ,
В. ЦАКУНОЎ.

ШЧАСЛІВЫ ЛЁС ПЕДАГОГА і ВУЧОНАГА

Да 70-годдзя М. Р. Ларчанкі.

У СЛАЎНЫ юбілейны год нашай краіны асабліва выразна адчуваеш, якую велізарную ролю адыграла перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў лёсе нашага народа і кожнага з нас у паасобку. Савецкая ўлада адкрыла шырокі доступ народу да асветы, да навукі. За гістарычна кароткі прамежак часу наша краіна ўзнялася да вышыняў прагрэсу і цывілізацыі.

У вялікім пераўтварэнні духоўнага свету нашага сучасніка ёсць і доля руплівай працы савецкага вучонага, педагога і пісьменніка, ветэрана старэйшай навучальнай установы нашай рэспублікі — Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, доктара філалагічных навук, прафесара Міхаіла Рыгоравіча Ларчанкі.

У 1932 годзе М. Ларчанка скончыў Вышэйшы педагагічны інстытут у Мінску, потым аспірантуру пры АН БССР. Пачатак навуковай дзейнасці маладога вучонага, як і мірная праца ўсяго савецкага народа, была перапынена Вялікай Айчыннай вайной. У суровым сорак першым годзе М. Ларчанка становіцца камуністам. У адным з баёў на Бранскім фронце палітрук М. Ларчанка быў цяжка паранен. Пасля шпіталя ў 1943 г. Міхаіл Рыгоравіч быў накіраван на працу ў Беларускі дзяржаўны універсітэт, які ў гэты час знаходзіўся на станцыі Сходня пад Масквой. Ён працуе загадчыкам кафедры беларускай літаратуры і мовы, дэканам філалагічнага факультэта, а з 1956 г. — загадчыкам кафедры беларускай літаратуры.

Сваю педагагічную дзейнасць Міхаіл Рыгоравіч паспяхова спалучае з навукова-даследчай. Ім выдадзена шмат кніг, у якіх ставяцца і вырашаюцца важныя і актуальныя праблемы беларускай філалогіі.

У манаграфіях «На шляхах да рэалізму» (1958) і «Па шляху рэалізму» (1959) даследуецца складаная праблема станаўлення і развіцця рэалістычнага напрамку ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

Важнае месца ў навуковай дзейнасці М. Р. Ларчанкі займае тэма беларуска-славянскіх узаемасувязей. Гэтай тэме прысвечаны манаграфіі «Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі суседніх славянскіх народаў» (1958), «Славянская супольнасць» (1963) і «Яднанне братніх літаратур» (1974). На багатым фактычным матэрыяле аўтар паказвае цесныя ўзаемасувязі беларускай літаратуры з рускай, украінскай, польскай, чэшскай, балгарскай і югаслаўскай літаратурамі. Асвятляецца таксама праблема яднання беларускай літаратуры з літаратурамі народаў Савецкага Саюза.

Пытанні ўплыву рускай і ўкраінскай літаратур на творчасць беларускіх пісьменнікаў разглядаюцца таксама ў шэрагу брашур М. Р. Ларчанкі («М. Багдановіч», 1949; «А. М. Горкі і беларуская літаратура», 1951; «Гогалеўскія традыцыі ў беларускай літаратуры», 1952 і інш.). Упершыню ў навуцы ў гэтых кнігах і брашурах М. Р. Ларчанкі з марксісцка-ленінскіх пазіцый асэнсоўваецца гістарычны матэрыял, на падставе якога ён робіць вывады аб няспынным развіцці літаратурнай узаемнасці і яднання славянскіх народаў, пачынаючы з часоў фарміравання нацыянальнай спецыфікі кожнай славянскай літаратуры.

Адначасова з даследаваннем праблем літаратуразнаўства М. Р. Ларчанка звяртаецца да аналізу фальклорных твораў. На аснове разгляду вуснай народнай паэзіі вучоны спрабуе вырашыць праблему спецыфікі адлюстравання рэчаіснасці ў фальклоры, імкнецца раскрыць своеасаблівасці рэалізму ў народнай творчасці. Асобную працу М. Р. Ларчанка прысвячае беларускаму казачнаму эпасу (змешчана ў кнізе «Жывая спадчына», 1977).

Пад рэдакцыяй М. Р. Ларчанкі і пры яго непасрэдным аўтарскім удзеле створан дапаможнік па курсу беларускай вуснапаэтычнай творчасці для студэнтаў філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў (1968). Міхаіл Рыгоравіч з'яўляецца таксама навуковым рэдактарам другога выдання хрэстаматыі «Беларускі фальклор» (1977).

Навуковыя даследаванні М. Р. Ларчанкі заслужана атрымалі высокую ацэнку шырокай грамадскасці і добра вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Гэтымі днямі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР яму прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР.

І сёння Міхаіл Рыгоравіч Ларчанка поўны творчай энергіі і сіл. З такім жа запалам і натхненнем, як і шмат гадоў назад, ён чытае лекцыі студэнтам, нястомна працуе над даследаваннем актуальных праблем беларускага літаратуразнаўства і фальклярыстыкі.

А. ФЯДОСІК,
доктар філалагічных навук.

«Веснік БДУ»

Выйшаў з друку і рассылаецца падпісчыкам лістападаўскі нумар навукова-тэарэтычнага часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна».

Нумар адкрываецца рубрыкай «Да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка». Тут змешчаны артыкулы доктара гістарычных навук, прафесара М. Я. Шкляра «Камуністычная партыя—натхняльнік і арганізатар перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі», доктара філасофскіх навук, прафесара А. С. Кляўчэні «Філасофская думка Беларусі за 60 год Савецкай улады», доктара юрыдычных навук, прафесара А. А. Галаўко «Кастрычнік і сацыялістычная дэмакратыя», доктара эканамічных навук, прафесара І. Д. Прахарэнкі і кандыдата эканамічных навук Я. А. Вірскага «Эканоміка Беларусі — састаўная частка адзінага народнагаспадарчага комплексу СССР», кандыдатаў філасофскіх навук А. Д. Гусева і І. Н. Смальцара «Вялікі Кастрычнік і сацыяльная палітыка Краіны Саветаў».

У раздзеле «Гісторыя» змешчаны артыкулы: Г. І. Ільяшчук «Крытыка меншавіцкай канцэпцыі сацыялістычнай рэвалюцыі ў творах У. І. Леніна (сакавік 1917—1923 гг.), У. М. Сідарцоў «Дзейнасць Саветаў БССР па ўцягненню рабочых у кіраўніцтва дзяржавай (1921—1925 гг.), Н. І. Яроміна «Палітычныя ўрокі дзейнасці ўрадаў Аванда-Тарэса ў Балівіі (1969—1971), Г. М. Ліўшыц «Выдатныя гісторыкі рэспублікі М. М. Нікольскі і У. М. Перцаў (да 100-годдзя з дня нараджэння)».

Раздзел «Філасофія» прадстаўлен артыкуламі З. Домбек «Навукова-тэхнічная рэвалюцыя пры сацыялізме і яе роля ў фарміраванні ўсебакова развітой асобы» і Л. Г. Цітарэнкі «Новы сцэнарый» Г. Кана для старога свету».

Выступленне П. П. Дроня «Пытанні павышэння эфектыўнасці камуністычнага выхавання студэнтаў у святле рашэнняў XXV з'езда КПСС» дадзена ў раздзеле «Навуковы камунізм». Тут жа змешчан артыкул Н. П. Саўко «Да пытання аб развіцці культурнага шэфства горада над вёскай ва ўмовах развітога сацыялізму».

У нумары шырока прадстаўлены раздзелы «Эканоміка», «Права», «Крытыка і бібліяграфія».

Б. ПЯТРОУСКІ.

У гэтым навучальным годзе чацвёртакурснікі факультэта журналістыкі будуць трымаць дзяржаўныя экзамены па замежнай мове. Залог паспяховай здачы — трывалыя веды, набытыя на практычных занятках.

Гэтыя здымкі зроблены ў групе, якая вывучае іспанскую мову. Тэма заняткаў — «Абмяркоўваем новую Канстытуцыю». На іспанскай мове, зразумела...

Фота **А. Зельдзіна.**

ПАЧАТАК ЁСЦЬ

Здаецца, яшчэ не змоўклі гукі развітальнага вальса на школьным вечары, здаецца, яшчэ не прайшло хваляванне перад уступнымі экзаменамі і не мінула вялікая радасць перамогі пры атрыманні студэнцкага білета, а вось ужо два месяцы, як мы студэнты універсітэта.

Надоўга застанецца ў памяці кожнага з нас 1-е верасня. Здавалася, што сонца ў гэты дзень вырашыла сабраць усю цеплыню сваіх промняў і аддаць яе людзям. Гэтак жа светла было на сэрцы ў кожнага з нас, дваццаці пяці вячэрнікаў факультэта журналістыкі. Дваццаць пяць чалавек, людзей рознага ўзросту, розных характараў, але з адзіным імкненнем, адзінай мэтай: вучыцца і працаваць — гэта складана і цяжка, але ў той жа час цікава. Надоўга застануцца ў памяці кожнага з нас словы аднакурсніцы Лены Мялежкі, сказаныя ў першы дзень вучобы: «Гэта ж цудоўна, што мы нарадзіліся і жывём у Краіне Саветаў, дзе кожны чалавек мае права праявіць свае магчымасці, выбраць сабе прафесію па душы».

Студэнцкае жыццё. Хочацца, каб яно не прайшло бясследна, каб добры ўспамін аб ім застаўся на ўсё жыццё.

...Паэзія. Калі гучыць верш, каго не кране за сэрца яго душэўны, хвалюючы змест. «Дзень паэзіі» вырашылі правесці 19 кастрычніка — дата, азнаменаваная пушкінскай паэзіяй. У цьмяным водбліску свечак, у незвычайнай цішыні заўсёды шумнай аўдыторыі неяк па-новаму, сардэчна гучалі вершы класікаў літаратуры, маладых паэтаў, пачынаючых аўтараў. «Іменна ў гэты дзень мы і закладалі фундамент вялікага, моцнага сяброўства, больш зразумелі адзін аднаго», —сказаў у заключэнне вечара староста групы Аляксандр Данец.

Мы — журналісты, і ў нас павінен быць свой орган друку, — рашыла група. І вось пачынае выходзіць газета.

...Паступіўшы ва універсітэт, мы зрабілі яшчэ адзін крок да здзяйснення пастаўленай мэты, бо працаваць у наш век без добрых, грунтоўных ведаў— немагчыма. Наперадзе кожнага з нас яшчэ чакаюць цяжкасці. Але, верым, нам дапаможа дружба.

За гэты час мы надзвычай пасябравалі, значыць, час прайшоў нездарма, значыць, пачатак у нас ёсць.

Л. АТРУШКЕВІЧ.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

У ЗАЛЕ НЕ ХАПАЛА МЕСЦ...

Біяфак доўга рыхтаваўся да свята пасвячэння першакурснікаў у студэнты. Арганізатарам і душой творчага калектыву быў малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі эксперыментальнай біялогіі А. Песнякевіч. З энтузіязмам рэпеціравалі старшакурснікі спектакль, сцэнарый якога напісалі студэнты Б. Ямінскі і Д. Гельтман.

«Пасвячэнне ў студэнты»... Першакурснікі чакалі яго не таму, што не лічылі яшчэ сябе сапраўднымі студэнтамі. Проста мы вельмі любім рытуалы. Чалавеку ўласціва самому ствараць для сябе традыцыі, святы. Гэта добрая рыса прымушае і шасцідзесяцігадовага старога да канца жыцця быць верным піянерскаму гальштуку.

Іменна таму хлапчукі з апавяданняў Аркадзя Гайдара верныя свайму «чэснаму слову», а пра вернасць камсамольскаму білету складаюцца легенды.

І вось актавая зала ўрачыста прыняла першакурснікаў, гасцей і ўсіх жадаючых паглядзець відовішча. Месц, як звычайна бывае ў такіх выпадках, не хапала. У першых радах залы—«віноўнікі» ўрачыстасці, першакурснікі. Іх чакала адкрыццё адной з самых цікавых навук — біялогіі, навукі пра жыццё.

З прывітальным словам да першакурснікаў звярнуўся сакратар партарганізацыі факультэта Л. Кахновіч.

Перад пачаткам свята быў выбран Куратар казкі. Ён паведаміў прысутным: «Прынцэса Біялогіі выдала Указ аб прыёме на I курс факультэта 100 чалавек». Спектакль пачаўся, і на сцэне паявіліся казачныя героі. Тут быў Ямеля і старая Шапакляк, Калабок і Дракон. Касцюмы і дэкарацыі вылучаліся вялікім вынаходніцтвам, добрым густам, былі зроблены з фантазіяй. А. Галдзянкоў, Е. Жыжэнка, Д. Куніцкі, В. Уварава, А. Казей, Л. Гаралёва, І. Пікулева і іншыя студэнты-акцёры хваляваліся, але ролі выконвалі добра. Ім дасталіся заслужаныя апладысменты.

Нечакана патухла святло, і на сцэну ў суправаджэнні двух факеланосцаў выйшаў Вялікі магістр (А. Мірашнічэнка). Загучалі словы клятвы першакурснікаў на вернасць біялогіі. Юнакі і дзяўчаты абяцалі быць стараннымі студэнтамі, вернымі сябрамі прыроды.

Н. ЛАПЕТА.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080, Мінск-80. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 21138 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 1842